ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!
СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
ЗВЯЗДА
6 СНЕЖНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 235 (28851)

Кірмаш ідэй

Кірмаш інавацыйных ідэй Smart Patent 2018 праходзіў у сталіцы на працягу двух дзён. У Палацы мастацтва былі прэзентаваныя найлепшыя наватарскія ідэі і распрацоўкі айчынных кампаній і груп, прайшлі прафесійныя семінары.

Фота БелТА.

Удзельнік кірмашу Сяргей НІКІТКІН назірае за працэсам 3D-друку.

ЛІЧБА ДНЯ

Больш за 10 тысяч білетаў

на II Еўрапейскія гульні ўжо знайшлі сваіх уладальнікаў у першыя дні продажаў. Найбольшым попытам карыстаюцца білеты на спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы, мастацкай гімнастыцы, веласіпедным спорце на шашы, а таксама на цырымоніі адкрыцця і закрыцця. Жыхары любой краіны могуць аформіць свае білеты ў яркае лета самастойна праз сайт www.minsk2019.ticketpro.by. У Беларусі іх можна таксама набыць у касах сеткі афіцыйнага білетнага аператара — кампаніі «Тыкетпро», а ў Еўропе — праз афіцыйных рэсэлераў. Кошт білетаў на спаборніцтвы ад Br5, або 2 еўра (для замежных грамадзян), да Br50, або, адпаведна, 20 еўра. На цырымонію адкрыцця цана вар'іруецца ад Br150 да Br300 у залежнасці ад катэгорыі месца. Цэны білетаў на цырымонію закрыцця крыху ніжэйшыя — ад Br70 да Br150.

КАРАТКА

- **Грашовае забеспячэнне ваеннаслужачых тэрміновай службы ў Беларусі з 1 студзеня ўзросце больш чым у два разы.**
- У краіне за 9 месяцаў бягучага года продаж новых аўтамабіляў вырас на 62 % у параўнанні з папярэднім годам.

- **У Брэсцкай вобласці тэсціруюць мабільную праграму, якая папярэджвае аб небяспецы паблізу чыгункі.**
- Колькасць крамаў у Беларусі ў студзені — верасні вырасла на 5,5 %, інтэрнэт-крамаў — на 14,8 %.
- **У Віцебску завяршаецца будаўніцтва Цэнтра па скачках на батуце.**

ISSN 1990 - 763X

Трэці ўзрост

«Дзеці і ўнукі ў захапленні ад маіх карцін!»

У Мінску прайшоў арт-фестываль «Дыялог ±60» з удзелам пажылых і маладых

«Сфатаграфуйце мяне на фоне гэтай карціны, калі ласка! — папрасіла мяне прыемная пажылая жанчына. — Мы яе ўсе разам малявалі. І ад душы пры гэтым весяліліся!»

СТАР. 13



Выстава карцін людзей трэцяга ўзросту.

Камунальныя стасункі

ПА ВЫЯЎЛЯЛЬНЫМ І ЗАЯЎЛЯЛЬНЫМ ПРЫНЦЫПЕ

Сістэма безнаяўных жыллёвых субсідый пашырана

Спецыялісты сістэмы ЖКГ расказалі, хто можа прэтэндаваць на частковую аплату жыллёва-камунальных паслуг.

Па словах **намесніка начальніка жыллёва-камунальнага аддзела філіяла «Адзіны разлікова-даведачны цэнтр Мінска» Цэнтра інфармацыйных тэхналогій Мінгарвыканкама Ганны БЕЛЬСКАЙ,** згодна з Указам Прэзідэнта Беларусі № 225, права на безнаяўныя жыллёвыя субсідыі атрымалі **па выяўляльным прынцыпе** мамы (альбо іншыя асобы), якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў, дзяцей-інвалідаў да 18 гадоў і якім выплачваюць адпаведныя дапамогі ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Таксама грамадзяне, якія атрымліваюць дапамогу па доглядзе за інвалідам I групы або пажылым пасля васьмідзесяцігадовага ўзросту.

Субсідыя гэтым людзям будзе выдзяляцца на падставе баз даных Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, ніякіх даведак і дакументаў збіраць не трэба.

Акрамя таго, **па заяўляльным прынцыпе** звяртацца па субсідыю змогуць грамадзяне або сем'і, якія не маюць уласнага жылля і пражываюць на здымных кватэрах альбо ў інтэрнаце прадпрыемстваў недзяржаўнай формы ўласнасці. Асноўная ўмова, як і раней, — штомесячная сума платы за жыллёва-камунальныя паслугі пры нарматыўным іх спажыванні не павінна перавышаць 20 % сярэднямесячнага сукупнага даходу сям'і ў горадзе і 15 % — на вёсцы.

СТАР. 2

Год малой радзімы

ДОБРЫЯ СПРАВЫ НА КАРЫСЦЬ РЭГІЁНА

Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Кацярына МУЗЫЧЭНКА:

— Год малой радзімы асацыюецца перш за ўсё з развіццём рэгіёнаў і населеных пунктаў, іх добраўпарадкаваннем і захаваннем унікальнай прыгажосці, стварэннем камфортных умоў пражывання, выхаваннем патрыятычнага стаўлення да роднай зямлі і народных традыцый. І тое, што наступныя два гады таксама пройдуць пад знакам малой радзімы, толькі на карысць нашай агульнай радзіме. Гэта ідэя аб'яднала ўсю Беларусь, усіх яе жыхароў мэтай зрабіць нашу Айчыну яшчэ лепшай.

Гэты год для Магілёўскай вобласці быў юбілейны, споўнілася 80 гадоў са дня яе ўтварэння. З гэтай нагоды ва ўсіх раёнах адбыліся святочныя мерапрыемствы, акорднай кропкай стаў вялікі канцэрт у абласным цэнтры. Наша ўпраўленне падрыхтавала шэраг інфармацыйных матэрыялаў па тэме «Магілёўская вобласць: гісторыя, спадчына, людзі». На працягу года ў працоўных калектывах вобласці праводзіліся адзіныя дні інфармавання, дзе размова ішла пра стварэнне вобласці, яе населеныя пункты з іх багатым мінулым. Мы ўспаміналі нашых знакамітых ураджэнцаў, літаратараў, асоб, якія паўплывалі на развіццё краіны. Унікальным выданнем стала кніга «Магілёўская вобласць: край, у якім мы жывём», падрыхтаваная калектывам інфармацыйнага агенцтва «Магілёўскія ведамасці».

Сёлета абласны цэнтр меў гонар прымаць у сябе ўдзельнікаў V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. За час падрыхтоўкі горад змяніўся: былі абноўлены фасады дамоў, добраўпарадкаваны дарогі, прывабнейшы стаў магілёўскі «Арбат» — вуліца Ленінская, дзе праходзіў вялікі міжрэгіянальны кірмаш. У горадзе пабольшала знакавых аб'ектаў, якія зрабілі яго яшчэ прыгажэйшым, — на ўездзе з боку Мінска з'явілася Трыумфальная арка ў гонар мужных і таленавітых жыхароў абласнога цэнтра, а каля спуску з плошчы Арджанікідзэ ў Падмікольскі парк — парадная лесвіца з каскадным фантанам.

Тэмай малой радзімы было прасякнута і купальскае свята рэспубліканскага ўзроўню «Александрыя збірае сяброў», якое праводзілася ў аграгарадку Александрыя Шклоўскага раёна восьмы раз. З кожным годам яно набірае абароты і становіцца ўсё больш папулярным. Акцэнт мерапрыемства ставіцца на сяброўскіх сувязях трох братэрскіх народаў — беларусаў, расіян і ўкраінцаў, якіх спрадвеку звязвалі агульныя традыцыі, гісторыя і... Дняпро — старадаўні гандлёвы шлях «з варагаў у грэкі». Менавіта на беразе гэтай ракі і праходзіць свята. У яго аснову пакладзена ідэя развіцця купальскіх традыцый у сусветнай прасторы і часе, а таксама культурны абмен паміж рознымі краінамі ў галіне нацыянальнай самабытнасці. Сёлета была магчымасць пабачыць на гэтым форуме, як шмат розных цікавых фестываляў прапануюць нашы рэгіёны — яны дэманстравалі свае візітоўкі. Тэма малой радзімы лягла ў аснову купальскага гала-канцэрта.

Шмат цікавых ідэй рэалізавалі ўстановы вобласці. Цэнтральная гарадская бібліятэка імя К. Маркса ў рамках праекта «Пра малую радзіму з любоўю» правяла анлайн-апытанне сярод магіляўчан, падчас якога тыя дзяліліся гісторыямі пра сваіх продкаў, згадвалі мілыя сэрцу куточкі, дзе яны нарадзіліся і выраслі. Вынікам праекта стане стварэнне на сайце ўстановы інфармацыйнага рэсурсу «Магіляўчане пра малую радзіму».

Году малой радзімы і 45-годдзю магілёўскага прадпрыемства «Магатэкс» быў прысвечаны дабрачынны марафон, які адбыўся падчас фестывалю «Вялікая бардрыбалка». За кожны кіламетр, які прабягалі ўдзельнікі акцыі, прадпрыемства пералічвала рубель на дабрачынны рахунак, дзе акумулююцца сродкі на адраджэнне архітэктурнай жамчужыны Беларусі першай паловы XVII стагоддзя — Быхаўскага замка. Усяго было сабрана 2 тысячы рублёў.

Актыўна праводзіцца ў вобласці рэгіянальная маладзёжная ініцыятыва Магілёўскай абласной арганізацыі БРСМ «Добрыя справы табе, мая малая радзіма!» Удзельнікі праекта самастойна выбіраюць месцы і віды работ. Займаюцца будаўніцтвам, уладкаваннем дзіцячых пляцовак, добраўпарадкаваннем дваровых тэрыторый, месцаў пахаванняў і помнікаў абаронцам Радзімы, паркаў і сквераў, прыпыначных пунктаў.

Тэлекампанія «Шклоў» распачала цыкл перадач «Малая радзіма малымі вачыма». Дзеці гэтага раёна вядуць гаворку пра родныя мясціны, славутых ураджэнцаў.

У Крычаве стартавала акцыя «Кніга добрых спраў», вынікам якой стане стварэнне друкаванага і электроннага варыянтаў кнігі з рэальнымі прыкладамі таго, як жыхары рэалізуюць карысныя для раёна праекты.

Парк любові і згоды створаны на Маладзёжным возеры ў Слаўгарадзе. Гэта ініцыятыва мясцовага прадпрыемства «Жылкамгас» стала пераможцам конкурсу ў рамках праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Ад вытокаў да развіцця», які быў рэалізаваны мясцовым фондам развіцця сельскіх тэрыторый «Адраджэнне-Агра».

Прыемна, што пра родны край не забываюць нашчадкі тых, хто калісьці жыў на нашай зямлі. Грамадзянін Швецыі Андрэй Дараган, прадзед якога Восіп Дараган пабудаваў на свае грошы ў канцы XIX стагоддзя чыгуначную ветку ў Асіповіцкім раёне, падараваў царкве Святога Панцеляймона ў аграгарадку Дараганава сямейныя іконы — яны на працягу доўгага часу перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Ён неаднаразова прыязджаў на малую радзіму сваіх продкаў разам з жонкай Ланай. Раённаму гісторыка-краязнаўчаму музею яны перадалі больш за 400 розных прадметаў і дакументаў, якія належалі знакамітаму роду. Пры садзейнічанні раённых уладаў і музея ў Асіповічах адкрылася адмысловая экспазіцыя, прысвечаная дваранскай сям'і Дараганаў.

А ў аграгарадку Мяжысеткі Магілёўскага раёна нядаўна з'явіўся храм у гонар Святога Уладзіміра. Гэта падарунак ад намесніка міністра замежных спраў Расіі Алега Сырамолатава — з населеным пунктам звязана жыццё яго сваякоў. Не забылася пра сваю малую радзіму і магіляўчанка Рыма Данільцава, якая стварыла ў вёсцы Вялікі Нежкаў Бялыніцкага раёна музей. У бацькоўскай хаце яна сабрала сямейныя фатаграфіі і прадметы побыту, якімі карысталіся ў мінулым стагоддзі яе родныя. І такіх прыкладаў шмат.

Зараз мы вядзём падрыхтоўку да яшчэ адной сур'ёзнай падзеі, якую будзем адзначаць налета, — 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Мы ў неаплатным даўгу перад тымі, хто заваяваў для нас Вялікую Перамогу, і будзем рабіць усё, што ад нас залежыць, каб захаваць мір і стабільнасць у краіне. Толькі разам мы зробім наша жыццё камфортным і бяспечным для нашых нашчадкаў.

Падрыхтавала Нэлі ЗІГУЛЯ.

ПА ВЫЯЎЛЯЛЬНЫМ І ЗАЯЎЛЯЛЬНЫМ ПРЫНЦЫПЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па выяўляльным прынцыпе субсідыі будуць выдзяляцца на квартал. Затым яны могуць аўтаматычна аднаўляцца. **Па заяўляльным прынцыпе** жыллёвыя субсідыі выдзяляюцца на паўгода. Па заканчэнні 6 месяцаў чалавек (сям'я) зноў можа звярнуцца па такую форму сацыяльнай падтрымкі.

Тым, хто разлічвае на яе атрыманне, неабходна прадставіць пакет дакументаў, які ўключае заяву, пашпарт, дакументы, што пацвярджаюць даходы ўласніка жылля і членаў сям'і за 6 месяцаў (даведка аб зарплаце, дапамогах, даходах ад прадпрымальніцкай дзейнасці і інш.); працоўную кніжку; пасведчанне аб нараджэнні дзіцяці (для тых, у каго ёсць дзеці да 18 гадоў); пасведчанне аб заключэнні (або скасаванні) шлюбу; пенсійнае пасведчанне або пасведчанне інваліда (калі ў сям'і ўласніка ёсць пенсіянеры або інваліды).

Па звестках Міністэрства ЖКГ, за 10 месяцаў гэтага года безнаяўная жыллёвая субсідыя выдзелена 29 745 хатнім гаспадаркам на суму больш за 865 тысяч рублёў.

Начальнік службы субсідавання філіяла «Адзіны разлікова-даведачны цэнтр Мінска» Цэнтра інфармацыйных тэхналогій Мінгарвыканкама Таццяна ОСІКАВА нагадала пра некаторыя нюансы. У прыватнасці, пра тое, што субсідуюцца толькі асноўныя жыллёва-камунальныя паслугі ў межах нарматываў спажывання, якія былі ўстаноўлены пастановай Савета Міністраў ад 30 верасня 2016 года № 789. Так, па тэхабслугоўванні ўлічваецца наступная норма: 20 кв. м на аднаго зарэгістраванага чалавека ў кватэры плюс 10 кв. м на сям'ю. Калі, напрыклад, у кватэры плошчай 54 кв. м пражываюць два чалавекі, у разлік будуць прымацца толькі 50 кв. м. Па водазабеспячэнні ўстаноўлена норма ў 140 л у суткі на чалавека. Усё, што было выкарыстана звыш нормы, прыйдзецца аплачваць самастойна і ў поўным аб'ёме. Не распаўсюджваецца субсідыя і на аплату дадатковых відаў жыллёва-камунальных паслуг, тых, ад якіх чалавек можа адмовіцца, напрыклад відэаназірання.

Атрымаць субсідыю могуць сем'і ці адзінокія грамадзяне, чые выдаткі на аплату жыллёва-камунальных паслуг перавышаюць 20 % ад сукупнага даходу ў горадзе і 15 % — у вёсцы.

Таццяна Осікава адзначыла, што ў сувязі з апошнімі зменамі ў заканадаўстве павялічылася колькасць атрымальнікаў субсідыі па выяўляльным прынцыпе і паменшылася — па заяўляльным.

Хто не атрымае субсідыю

З 1 студзеня 2019 года субсідыі не будуць выдзяляцца грамадзянам, якія ўнесены ў спісы працаздольных, але не занятыя ў эканоміцы і пры гэтым не стаяць на ўліку ў службе занятасці як беспрацоўныя. Аднак члены сям'і, якія пражываюць сумесна з імі, маюць права на атрыманне субсідый.

Калі ў чалавека няма ніякага даходу (нагадаем, што ў якасці даходу, акрамя заробку, разглядаецца стыпендыя, пенсія, дапамога па беспрацоўі — як самога грамадзяніна, так і членаў сям'і, якія пражываюць з ім), матдапамога таксама не налічаецца.

Не атрымаюць субсідыю і сем'і, у якіх дзве і больш кватэры, зарэгістраваныя фірмы ў згаданым памяшканні, здаюцца пакоі ўнаём. Адмовіць могуць і з прычыны непрадастаўлення неабходнага пакета дакументаў, а таксама ў сувязі з тым, што сума платы за жыллёва-камунальныя паслугі не дасягае 20 % сярэднямесячнага сукупнага даходу.

Святлана БУСЬКО.

Да ведама

Са студзеня вырасце мінімалка

З 1 студзеня 2019 года месячная мінімальная зарплата ўстаноўлена ў памеры 330 рублёў. Рашэнне прынята пастановай Савета Міністраў ад 5 снежня 2018 года № 870, інфармацыю пра гэта можна ўбачыць на сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Памер пагадзінnай мінімальнай заработнай платы вызначае наймальнік шляхам дзялення памеру месячнай мінімальнай зарплаты на суадносіны разліковай нормы рабочага часу каляндарнага года (устаноўленай для адпаведных катэгорый работнікаў наймальнікам) і колькасці месяцаў каляндарнага года.

Наймальнік абавязаны прымяняць мінімальную заработную плату (месячную і пагадзінную) у якасці ніжэйшай мяжы аплаты працы работнікаў за працу ў нармальных умовах на працягу нармальнай працягласці рабочага часу пры належным выкананні абавязкаў работнікам. Пры гэтым мінімальная заработная плата (месячная і пагадзінная) прымяняецца з улікам адпрацаванага рабочага часу.

Калектыўным дагаворам (пагадненнем) можа быць устаноўлены іншы памер месячнай мінімальнай зарплаты, але не ніжэй за ўстаноўлены ўрадам.

Святлана БУСЬКО.

Жыллё

Іпатэка актывізуе будаўніцтва

У нашай краіне плануецца ўвесці сістэму жыллёва-будаўнічых зберажэнняў і іпатэку.

Пра гэта паведаміў **намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір КУХАРАЎ** падчас рэспубліканскага семінара-нарады па павышэнні эфектыўнасці будаўнічага комплексу. Віцэ-прэм'ер адзначыў, што адпаведныя нарматыўныя дакументы практычна гатовыя. «Думаю, што да канца года іх дапрацуем і будзем уносіць на разгляд кіраўніку дзяржавы. Гэта дасць штуршок для прыцягнення зберажэнняў грамадзян», — падкрэсліў ён.

Акрамя таго, Уладзімір Кухараў адзначыў, што кошт індывідуальных жылых дамоў будзе зніжацца з пераходам на серыйнае будаўніцтва. «Мы робім упор на індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва. Першае, што імкнёмся рабіць, — гэта зніжаць кошт жылля. Дыяпазон цэн паказвае, што ў гатовым выкананні кошт аднаго квадратнага метра складае каля 400 долараў у эквіваленце. Гаворка ідзе пра дамы ў індывідуальным выкананні, — сказаў Уладзімір Кухараў. — Калі пяройдзем на серыю, будзем зніжаць гэтую цану, каб зрабіць дамы максімальна даступнымі для насельніцтва».

Сяргей КУРКАЧ.

З ПРЫЗАМІ І ЭМОЦЫЯМІ

Адбылася цырымонія закрыцця футбольнага сезона «Зорны мяч — 2018»

Яна пачалася традыцыйна з уступнага слова старшыні АБФФ Сяргея Румаса.

«Сезон атрымаўся адным з самых яркіх і эмацыянальных у нашай найноўшай спартыўнай гісторыі, — адзначыў ён. — *У нацыянальным першынстве бескампрамісная барацьба трымала балельшчыкаў у напружанні аж да заключнага тура. Прычым мы не ведалі ні як размяркуюцца месцы на п'едэстале, ні хто акажацца за бортам вышэйшай лігі. На жаль, гэты яркі сезон азмрочыла серыя незаменных страт. У 2018 годзе ад нас сышлі сапраўдныя глыбы, з імёнамі якіх звязаны цэлыя эпохі ў гісторыі беларускага футбола».*

Затым таксама традыцыйна былі адзначаны найлепшыя футбалісты і трэнеры ў розных намінацыях.

Фота БелТА.

Падчас урачыстай цырымоніі.

Найлепшым футбалістам Беларусі сезона-2018 названы Ігар Стасевіч (БАТЭ), ён жа чацвёрты раз запар прызнаецца найлепшым паўабаронцам і трэці раз запар найлепшым гульцом вышэйшай лігі. Найлепшым варатаром стаў Андрэй Гарбуноў («Дынама-Мінск»). Прыз найлепшага абаронцы атрымаў футбаліст салігорскага «Шахцёра» Павел Рыбак. Павел Савіцкі стаў найлепшым нападаючым і найлепшым бамбардзірам чэмпіянату.

Найлепшая судзейская брыгада выглядае наступным чынам: Аляксей Кульбакоў, Дзмітрый Жук, Юрый Хомчанка. Прыз трэнера года атрымаў Віктар Ганчарэнка, які ўзначальвае маскоўскі ЦСКА.

Уладзімір Жыгалка з МФК «Лідсельмаш» і Ігар Брыштэль, які выступае за брэсцкі ПФК «ПроДом», атрымалі прызы як найлепшыя футбалісты Беларусі па міні-футболе і пляжным футболе адпаведна.

У прадстаўніц прыгожага полу найлепшым гульцом чэмпіянату 2018 года стала нападаючая футбольнага клуба РДВАР Карына Альховік, а найлепшай футбалісткай Беларусі прызнана Паліна Шаціленя з ЖФК «Мінск».

Футбольны клуб БАТЭ атрымаў прызы «Справядлівай гульні» і «За волю да перамогі», прыз «Двума складамі» адправіўся ў футбольны клуб «Дынама-Мінск». Узнагарода «Глядацкіх сімпатый» дасталася футбольнаму клубу «Дынама-Брэст».

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Як нас дураць

Выманілі 11 тысяч долараў

Чарговай ахвярай інтэрнэт-махляроў стаў жыхар Гродна.

43-гадовы работнік аднаго з будаўнічых таварыстваў звярнуўся ў Гродзенскі міжраённы аддзел Следчага камітэта з заявай. У пачатку восені ён стаў атрымліваць праз інтэрнэт паведамленні ад кампаніі Super binary, якая прапаноўвала заробак на правядзенні бінарных апцыёнаў з фіксаваным памерам даходу. Спачатку гродзенец адмаўляўся ад супрацоўніцтва, але прадстаўнікі кампаніі паабяцалі яму падваенне ўкладзеных сродкаў і пераканалі зрабіць укладанні. У выніку мужчына пералічыў кампаніі звыш 11 тысяч долараў ЗША, для чаго ўзяў крэдыты ў банках і залажыў уласны аўтамабіль.

Калі ён паспрабаваў вывесці 20 тысяч долараў, якія нібыта знаходзіліся ў яго на рахунку, у кампаніі запатрабавалі пералічэння яшчэ некалькіх тысяч долараў. Калі мужчына адмовіўся выканаць гэтае патрабаванне, з ім перасталі выходзіць на сувязь.

Следчым камітэтам была распачата крымінальная справа па факце завалодання маёмасцю шляхам падману ў асабліва буйным памеры (ч. 3 арт. 209 КК Рэспублікі Беларусь).

Пры высвятленні абставін злачынства было ўстаноўлена, што пацярпелы пералічваў свае грашовыя сродкі ў Чэшскую Рэспубліку. Пры гэтым да таго, як пералічыць грошы, ён не азнаёміўся з інфармацыяй, якая ёсць у інтэрнэце, адносна кампаніі Super binary, дзе сказана, што паслугі гэтай кампаніі з'яўляюцца чыстай вады ашуканствам, і грамадзяне ўжо не адной краіны сталі яе ахвярамі.

Як заўважылі ў Следчым камітэце, нягледзячы на неаднаразовыя папярэджанні праваахоўных органаў, людзі ў пагоні за звышпрыбыткамі працягваюць рабіць фінансавыя аперацыі, не прытрымліваючыся самых элементарных правілаў бяспекі.

Сяргей КУЛАКОЎ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Прадукты ў Вялікабрытаніі адчувальна падаражэюць у выніку Brexit

Вялікабрытанія можа сутыкнуцца з падаражэннем прадуктаў харчавання ў сярэднім на 10 працэнтаў, калі яе выхад са складу ЕС ажыццявіцца па найгоршым з магчымых сцэнарыяў, перадае BBC. Пра гэта заявіў, выступаючы ў брытанскім парламенце, кіраўнік Банка Англіі Марк Кэрні. «Розныя катэгорыі прадуктаў, само сабой, па-рознаму зменяцца ў цане, але як гэта заўсёды бывае, калі цэны на адно растуць мацней, чым на іншае, людзі будуць пераходзіць на іншыя прадукты», — сказаў Кэрні, словы якога прыводзіць ТАСС. Паводле яго слоў, у выпадку Brexit з «памяркоўнымі наступствамі» адчувальнага негатыўнага змянення цэн таксама не пазбегнуць, але рост складзе 6 працэнтаў. У гэты рост будзе закладзены і эфект ад паслаблення брытанскага фунта стэрлінгаў, мытныя пошліны, а таксама выдаткі, звязаныя з мытнымі праверкамі. Некаторыя парламентарыі сталі вінаваціць Кэрні ў панікёрстве, але кіраўнік Банка Англіі заўважыў, што агучаныя ацэнкі сітуацыі сталі вынікам шматгадовага аналізу, які праводзіцца з прыцягненнем 20 найстарэйшых эканамістаў і яшчэ каля 150 розных экспертаў. Кэрні таксама дадаў, што ў цэлым фінансавы сектар Вялікабрытаніі гатовы да Brexit. У канцы мінулага месяца Банк Англіі таксама папярэдзіў аб тым, што курс брытанскага фунта стэрлінгаў можа абваліцца на чвэрць у выпадку найгоршага сцэнарыя Brexit. Для таго каб пагадненне ўступіла ў сілу, яно павінна атрымаць адабрэнне Еўрапарламента і брытанскіх заканадаўцаў. Яны, як пакуль плануецца, павінны разгледзець яго 11 снежня. Сам Brexit запланаваны на 29 сакавіка 2019 года.

Forbes назваў самых уплывовых жанчын свету

Forbes склаў рэйтынг 100 самых уплывовых жанчын свету па выніках 2018 года. Як і год таму, на чале спіса — канцлер Германіі Ангела Меркель. Другі радок за год таксама не змяніўся — там па-ранейшаму прэм'ер Вялікабрытаніі Тэрэза Мэй. Замыкае тройку сёлета кіраўнік МВФ Крысцін Лагард (год таму на яе месцы была жонка заснавальніка Microsoft Біла Гейтса Мелінда, цяпер яна на шостай пазіцыі). Чацвёртае і пятае месцы занялі Мэры Бара (выканаўчы дырэктар General Motors) і кіраўнік інвесткампаніі Fidelity Investments Эбігейл Джонсан. Сёмае месца — у кіраўніка YouTube Сьюзан Вайжыцкі, за ёй у спісе — Ана Патрысія Боцін (узначальвае найбуйнейшы банк Іспаніі Banco Santander). Замыкаюць дзясятку Мэрылін Х'юсан (кіраўнік аяібудаўнічай кампаніі Lockheed Martin) і Джыні Рамеці (IBM). Са 100 самых уплывовых жанчын свету 20 — пачаткоўцы рэйтынга. Сярод іх — тэнісістка Серэна Уільямс (79-е месца), прадзюсар, стваральнік тэлесерыяла «Анатомія страсці» Шонда Раймс (74), кіраўнік Нью-Ёркскай фондавай біржы Стэйсі Канінгам (27). З тых, хто за год пакінуў рэйтынг, найбольш прыкметныя імёны — колішні дзяржсакратар ЗША Хілары Клінтан, лідар М'янмы Аун Сан Су Чжы.

Прамыя перагаворы Кабула і талібаў могуць пачацца ўжо сёлета

Прамыя перагаворы аб міры паміж урадам Афганістана і радыкальным рухам «Талібан» могуць пачацца ў хуткім часе, у шэрагах талібаў расце імкненне хутчэй запусціць гэты працэс, паведаміў у інтэрв'ю РІА «Навіны» афіцыйны прадстаўнік Вышэйшага савета міру (ВСМ) Афганістана Іхсан Тахер. «Мы спадзяёмся, што прамыя мірныя перагаворы паміж урадам і «Талібанам» пачнуцца ў самы бліжэйшы час. Згодна з нашым крыніцамі, такое імкненне нарастае на розных узроўнях кіраўніцтва «Талібана», — сказаў Тахер. Ён растлумачыў, што гаворка ідзе пра імкненне пачаць дыялог з урадам Афганістана без пасрэднікаў, а таксама разглядаць праблему аднаўлення міру ў краіне ў якасці ключавой. «Усё гэта — пытанні, якія з'яўляюцца «зялёным святлом» для будучага Афганістана, і мы спадзяёмся, што прамы дыялог паміж урадам і талібамі пра будучыню краіны пачнецца альбо ў бягучым, альбо ў наступным годзе», — заявіў прадстаўнік ВСС.

Тарыфы

ПАСЛУГІ ПОШТЫ І ЭЛЕКТРАСУВЯЗІ ПАДАРАЖЭЮЦЬ

Гэта прадугледжана пастановай Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю № 84 ад 27 лістапада 2018 года. Каментуючы згаданы дакумент, у міністэрстве нагадалі, што паслугі электрасувязі і паштовай сувязі з'яўляюцца сацыяльна значнымі, і тарыфы на іх рэгулююцца дзяржавай.

Нягледзячы на мерапрыемствы, якія праводзяцца аператарамі сувязі па зніжэнні сабекошту паслуг, яны ўсё роўна застаюцца стратнымі. Узровень кампенсацыі насельніцтвам паслуг тэлефоннай сувязі не перавышае 90 %, паштовай сувязі — 85 %. Таму прынятае рашэнне аб павышэнні тарыфаў з'яўляецца крокам да выхаду на поўную акупнасць гэтых паслуг.

Тарыфы на паслугі электрасувязі агульнага карыстання павысяцца ў наступных памерах: абаненцкая плата за асноўны тэлефон для фізічных асоб — на 27 капеек у месяц; пачасовая плата за мясцовыя тэлефонныя злучэнні для фізічных асоб — на 0,05 капейкі за хвіліну; пачасовая плата за міжгароднія тэлефонныя злучэнні — на 0,1 капейкі за хвіліну для фізічных асоб і на 0,11 капейкі за хвіліну для юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў. Павышэнне тарыфаў складзе ад 7,3 % да 9,6 %.

Што датычыцца паслуг паштовай сувязі, то перасылка фізічнымі асобамі простай паштовай карткі, ліста, бандэролі вагой да 20 грамаў падражэе на 6 капеек, ці на 14,3 %; перасылка кожных наступных 20 грамаў паштовых адпраўленняў — на 1 капейку, або на 33, 2 %. Павышэнне тарыфаў на паштовыя паслугі для юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў прадугледжана ў тых жа памерах.

Новыя тарыфы пачнуць дзейнічаць з 16 снежня 2018 года.

Разам з тым у рамках падрыхтаванага праекта Закона «Аб натуральных манаполіях» Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю прапанавала выключыць паслугі электрасувязі і паштовай сувязі са сфер натуральных манаполій. Гэта азначае адмену прамога цэнавага рэгулявання і развіццё канкурэнцыі ў гэтых сферах.

Надзея НІКАЛАЕВА.

АСЦЯРОЖНА: СЛІЗКА!

Пачатак снежня выпрабоўвае беларусаў галалёдзіцай: больш за 1 100 галалёдных і халадовых траўмаў зафіксавана ў Беларусі за двое сутак — 3 і 4 снежня.

У прыватнасці, 4 снежня 579 чалавек звярнуліся з гэтай нагоды да медыкаў. Як паведамілі ў прэс-службе Міністэрства аховы здароўя, найбольшая колькасць людзі галалёдных і халадовых траўмаў адзначаецца ў Брэсцкай вобласці — 222. У Мінску па медыцынскую дапамогу звярнулася 125 чалавек. Больш за паўсотні пацярпелі ад галалёдзіцы ў Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцях.

Найбольш траўманебяспечнымі месцамі ў галалёдзіцу медыкі называюць прыступкі пад'ездаў і падземных пераходаў, прыпынкі грамадскага транспарту, горкі, у тым ліку дзіцячыя. І раяць выбіраць адпаведны надвор'ю абутак, а жанчынам адмовіцца ад абцасаў, перасоўвацца няспешна, кароткімі крокамі. Не трэба імкнуцца «ўпасці прыгожа», чым грашаць звычайна жанчыны, неабходна згрупавацца і імкнуцца падаць на бок. Старайцеся пазбягаць падзення на спіну і патыліцу, не выстаўляйце рукі ці ногі, бо любая канечнасць бярэ на сябе ўсю сілу ўдару. Калі вы ўсё ж атрымалі траўму, не варта займацца самалячэннем, напрыклад, упраўляць вывіх, а трэба звяртацца да медыкаў.

Алена КРАВЕЦ.

Чулі?

«ЗАЛАТЫ ГРАМАФОН» МОЖНА БУДЗЕ ЎБАЧЫЦЬ АНЛАЙН



Штогадовая расійская эстрадная прэмія, якая будзе ўручацца артыстам дваццаць трэці раз, зноў прыедзе ў Беларусь — гала-канцэрт пройдзе 9 снежня ў «Мінск-Арэне». Удзел у ім возьме дэсант выканаўцаў, што называецца, першага эшалона: Філіп Кіркораў, Валерый Меладзэ, Мікалай Баскаў, Вера Брэжнева, Ані Лорак, Паліна Гагарына, Зара, Burito, «Градусы», а таксама прадстаўнікі новага пакалення поп-музыкі, чые хіты не адзін месяц запаўнялі вушы слухачоў і эфір радыёстанцый.

Як падкрэсліваюць арганізатары шоу, мінская версія нічым не будзе адрозніваца ад маскоўскай: той жа шык, бляск, пафас і гламур — і такая ж немаленькая цана на білеты, якая пачынаецца ад 63 і даходзіць да 280 рублёў, што, праўда, не перашкодзіла ў мінулыя разы сабраць поўную залу. А сёлета пры жаданні ёсць магчымасць убачыць чатырохгадзінную цырымонію і бясплатна — на стрым-канале VOKA live, падключыцца да якога можна з камп'ютара (калі прайсці аўтарызацыю на сайце voka.tv), планшэта, мабільнага тэлефона (трэба ўсталяваць мабільную праграму VOKA) або тэлевізара (праз праграму Smart TV ці ТБ-прыстаўку).

Вікторыя ЗАХАРАВА.

На кантролі

НЕЗДАРОВЫ ДЫСБАЛАНС

Пасля маштабнай праверкі меню бальнічных сталовых мусіць стаць больш збалансаваным і разнастайным

...У Быхаўскай цэнтральнай раённай бальніцы ў меню пацыентаў мяса перыядычна замянялі на сыр ці смятану, яйкі — на малако, сухафрукты — на цукар. У Брэсцкай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі такая страва, як бефстроганаў з соусам, была ў меню пяць разоў на тыдзень, салата з буракоў і віточкі парывя — шэсць разоў на тыдзень... Гэтыя і шматлікія іншыя парушэнні былі знойдзены падчас маштабнай праверкі арганізацыі харчавання пацыентаў ва ўстановах аховы здароўя. Яе вынікі былі разгледжаны на калегіі Камітэта дзяржкантролю.

Як адзначыў **старшыня ведамства Леанід АНФІМАЎ,** забеспячэнне якасным харчаваннем хворых — гэта не толькі мера сацыяльнай абароны, але і спадарожны элемент аказання лячэбнай дапамогі ў стацыянары.

— Наша праверка паказала, што зацверджаныя нормы харчавання, якія павінны забяспечваць патрэбу хворага ў неабходных рэчывах і калорыях, паўсюдна не выконваюцца. Зразумела, што бальніца — не рэстаран, але пэўная разнастайнасць павінна быць, — адзначыў Леанід Анфімаў.

Аднак якасць харчавання — толькі адзін бок праблемы. Эфектыўнасць выкарыстання дзяржаўных сродкаў, якія ідуць на харчаванне пацыентаў, таксама выклікала пытанні ў правяраючых. Штогод на гэтыя мэты з бюджэту, між іншым, выдаткоўваецца больш за 100 мільёнаў рублёў. І зарабіць тут атрымліваецца шматлікім пасрэднікам.

— Наколькі рацыянальна і аптымальна пабудавана сістэма закупак прадуктаў, як выкарыстоўваюцца немалыя бюджэтныя сродкі, ці няма прабелаў у заканадаўстве, якія дазваляюць камусьці на гэтым нажывацца — з усімі гэтымі пытаннямі давялося разбірацца Камітэту дзяржкантролю. Аналіз паказаў, што калі харчаванне забяспечваецца самімі ўстановамі аховы здароўя, то закупкі харчовай сыравіны і прадуктаў праводзяцца на конкурснай аснове. Калі ж юрыдычнымі асобамі, што спецыялізуюцца на грамадскім харчаванні, якім структуры аховы здароўя пералічваюць бюджэтныя сродкі, — то на іх не распаўсюджваецца заканадаўства аб закупках. Але ж тут выкарыстоўваюцца бюджэтныя сродкі. Чаму не ўстанавіць адзіны парадак дзяржзакупак на арганізацыю харчавання ва ўстановах аховы здароўя? Сістэма закупак проста пранізана пасрэднікамі структурамі. Ва ўстановах аховы здароўя быццам бы не чулі пра даручэнне кіраўніка дзяржавы аб выключэнні неабгрунтаванага пасрэдніцтва, — падкрэсліў Леанід Анфімаў.

Прадпрыемства «Вітамін», якое арганізуе харчаванне ў сталічных установах аховы здароўя, напрыклад, закупляла айчыннныя таматы ў пасрэдніка ў 3,5 раза даражэй, чым кошт вытворцы. Яно фарміравала цану на прадукты не ад кошту вытворцы, ад кошту пастаўшчыка — пасрэдніка. У выніку толькі па двух найменнях прадуктаў установы аховы здароўя залішне выплацілі амаль мільён рублёў. На прадпрыемстве «Дыета» (Магілёў) толькі на закупках чатырох найменняў прадуктаў (мяса птушкі, мясныя паўфабрыкаты, разынкі, алей) розніца ў кошце паміж пасрэднікамі і вытворцамі склала 45 тысяч рублёў.

Выявілі правяраючыя і факты недаўкладання сыравіны пры прыгатаванні страў, а таксама крадзяжы прадуктаў. Напрыклад, падчас агляду складскіх і вытворчых памяшканняў «Вітаміну» ў шахце грузавога ліфта былі знойдзены падрыхтаваныя да вынасу смятана, малако, паўфабрыкаты са свініны і яблыкі. У Гомельскай гарадской клінічнай бальніцы № 3 з выбраных падчас праверкі сямі страў для даследавання на паўнату ўкладання сыравіны шэсць не адпавядалі нормам. У прыватнасці, у шніцалі натуральным рубленым доля хлеба, утрыманне якога не дапускаецца, складала 20 %.

Былі нараканні ў дзяржкантралёраў і на саміх вытворцаў. Яны часта або ўвогуле не прымаюць удзелу ў працэдурах закупак, або заяўляюць цэны на сваю прадукцыю, якія нашмат вышэйшыя за рыначныя. Паводле інфармацыі **начальніка ўпраўлення кантролю спажывецкага рынку, сферы паслуг і за абаротам падакцызных тавараў Камітэта дзяржаўнага кантролю Алены МАСУРНОЎСКАЙ,** падчас правядзення закупак Гомельскай гарадской бальніцай № 4 тушак куранят і мясной прадукцыі на аўкцыён не заявіўся ні адзін вытворца названай прадукцыі, а таргі выйграла пасрэдніцкая структура. Мінскі мясакамбінат прапанаваў прадпрыемству «Вітамін» мясны паўфабрыкат са свініны па цане 10,32 рубля за 1 кг, у той час як у рознічнай сетцы яго цана была 8,33 рубля.

Патрабуе перагляду сістэма цэнаўтварэння на харчаванне для ўстаноў аховы здароўя, адзначылі ў Камітэце дзяржкантролю. Цэны на прадукты для пацыентаў не падпадаюць пад дзяржрэгуляванне, у той час як цэны, напрыклад, на харчаванне для школьнікаў, якое аплачваецца пераважна за сродкі бацькоў, жорстка рэгулююцца дзяржавай.

Па выніках праверкі 261 чалавек атрымаў адміністрацыйнае ці дысцыплінарнае пакаранне. У бюджэт на сёння ўдалося вярнуць больш за 200 тысяч рублёў, якія незаконна выкарысталі ўстановы аховы здароўя. Да пэўнага тэрміну яны абавязаны выправіць выяўленыя недахопы. Да канца бягучага года будуць унесены змены ў пастанову Міністэрства аховы здароўя № 135 «Аб зацвярджэнні інструкцыі аб арганізацыі дыетычнага харчавання ва ўстановах аховы здароўя».

— Будзе ўзмоцнена адказнасць кіраўнікоў устаноў аховы здароўя і саветаў па лячэбным харчаванні, — адзначыла Алена Масурноўская. — А меню ў бальнічных сталовых стане больш разнастайнае і збалансаванае.

Алена КРАВЕЦ.

Здарэнне

Хацеў абрабаваць інкасатара

Брастаўчанін паспрабаваў абрабаваць інкасатара з дапамогай электрашокера.

Інцыдэнт адбыўся на праспекце Машэрава каля аддзялення Парытэтбанка. Зламыснік чакаў каля абменнага пункта, пакуль інкасатары забяруць выручку. І калі адзін з іх выйшаў з памяшкання, рабаўнік напаў на яго, ударыў шокерам, паспрабаваў выхапіць сумку. Але каштоўны груз інкасатар не аддаў, падчас валтузні з сумкі выпаў пачак грошай, зламыснік схапіў яго і спрабаваў уцячы. Тады супрацоўнік выстраліў у паветра.

Тым часам кіроўца-інкасатар паехаў за злодзеем і затрымаў яго. Як паведаміў **афіцыйны прадстаўнік абласнога ўпраўлення ўнутраных спраў Сяргей ДУЧЭНКА**, нападнікам аказаўся 33-гадовы гараджанін, раней не судзімы. Матывы яго ўчынку высвятляюцца, яму пагражае вялікі тэрмін пазбаўлення волі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ

«Удалы шопінг са «Звяздой»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Удалы шопінг са «Звяздой» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 7 снежня 2018 года да 19 лютага 2019 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2019 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — Установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Удалы шопінг са «Звяздой» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара Гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — і складаецца з наступных рэчаў:

№ п/п	Назва	Колькасць (шт.)	Цана за шт., руб. кап.	Усяго, руб. кап.
1.	Падарункавы сертыфікат на суму 300 рублёў УП «Універмаг Беларусь»	1	300,00	300,00
2.	Падарункавы сертыфікат на суму 100 рублёў УП «Універмаг Беларусь»	7	100,00	700,00

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Удалы шопінг са «Звяздой» складае:

1 000,00 (Адна тысяча рублёў нуль капеек).

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Удалы шопінг са «Звяздой» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2019 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2019 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Установы ў перыяд з 7 снежня 2018 года да 8 студзеня 2019 года выразаная з газеты або з укладыша ў газету запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 7 да 31 снежня 2018 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі Установе пасля 9 студзеня 2019 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні «Удалы шопінг са «Звяздой» Установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Міхайлічэнка Алена Віктараўна — загадчык аддзела маркетынгу рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Корбут Віктар Эдуардавіч — загадчык адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда.

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 10 студзеня 2019 года ў 12 гадзін у памяшканні Установы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і гарадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 падарункавых сертыфікатаў на 100 рублёў (па аднаму для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз — падарункавы сертыфікат на 300 рублёў.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні, прадстаўнікоў незалежных арганізацый або члены Камісіі. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 20 студзеня 2019 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 20 студзеня 2019 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

16. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2019 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2019 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2019 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы выдаюцца пераможцам у тэрмін да 19 лютага 2019 года ў памяшканні Установы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00, з панядзелка да суботы (выдачу ў суботу неабходна ўзгадніць з арганізатарам гульні па тэлефонах: (017) 263 66 73, 287 17 40, для атрымання прапускных дакументаў). Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў дзеля атрымання прыза, Установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 19 лютага 2019 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

21.Тэрмін рэалізацыі падарункавых сертыфікатаў — з моманту атрымання да 19 лютага 2019 года ўключна.

VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

22. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

23. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Установай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Установе.

24. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Удалы шопінг са «Звяздой» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

25. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефонах: (017) 263 66 73, 287 17 40.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3440 ад 04.12.2018 года выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
6 СНЕЖНЯ 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 23 (15854)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Алёна БЕЛАНОЖКА:

«ЧЫСТАЯ ЛІТАРАТУРА» НАЎРАД ЦІ ПРАКОРМІЦЬ»

Маналог маладой пісьменніцы пра жыццё і творчасць

Фота Канстанцінa ДРОБАВА.

«Складана сказаць, калі ў мяне ўсё пачалося. Без літаратурнай дзейнасці сябе не ўяўляю ўвогуле. Я многа чытала і — само сабою — многа пісала ў школе. Заўсёды нешта нараджалася: вершы, сцэнарыі свят. Так што аддзяліць сябе ад літаратуры, сказаць «вось тут я не пішу яшчэ, а тут — пачала», немагчыма. Ды і, напэўна, мала хто можа пра сябе расказваць, што, маўляў, прачнуўся аднойчы раніцай і падумаў: «А стану я пісьменнікам!» Самы першы мой твор з'явіўся, калі мне было пяць гадоў. Гэта быў верш, прысвечаны Першамаю. Двухрадкоўе пра людзей, якія ідуць і махаюць паветранымі шарыкамі. У сцэнарыях масавых свят і цяпер калі-нікалі вяртаюся да тэмы «людзей з шарыкамі», атрымліваецца, ёсць своеасаблівая пераемнасць. Прадвызначанасць.

Аўтарам у поўным сэнсе гэтага слова я пачала сябе лічыць тады, калі прыйшла ў «Маладосць» у 2008 годзе. Да Вікі Трэнас, тагачаснага рэдактара аддзела паэзіі, прынесла свае вершы. І, калі праз пэўны час пабачыла іх апублікаванымі, мне ў рэдакцыі адкрытым тэкстам сказалі: «Вось, ты цяпер пісьменнік рэспубліканскага маштабу!» Да гэтага, атрымліваецца, усё было непрафесійна: так, самадзейнасць, хобі. А калі мы ўжо друкуемся, набываем публічнасць — гэта трошкі іншае самаўспрыманне. З'яўляецца адказнасць за тое, што пішаш і публікуеш.

***

Калі знаёмлюся з кімсьці, кажу, што я — рэжысёр-сцэнарыст. Гэта для мяне, напэўна, найбольш важна. Сцэнарыст — гэта не тое самае, што пісьменнік, тут свая спецыфіка. Можна не быць пісьменнікам, але пры гэтым рабіць добрыя кампілятыўныя формы сцэнарыяў. У арыгінальных, якія ад першай літары да апошняй кропкі пішаш сам, канешне, здольнасці пісьменніка прыдадуцца. Прыдасца валоданне словам.

Рэжысёр унутры мяне з пісьменнікам не канфліктуе. Ніколі. Рэжысёр проста цісне і дыктуе. Бачыць нейкую лішнюю дэталь — і бязлітасна яе прыбірае. Бо ўсё павінна працаваць на сюжэт, ніякіх лірычных адступленняў. Я ўвогуле лянівы аўтар, не люблю апісанняў. Не маё гэта, не пра мяне. Алёна — усе ведаюць — выкарыстоўвае збольшага дзеясловы. Прыйшоў. Узяў. Перамог.

Але ўсё ж я — рэжысёр-сцэнарыст.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Занятак па душы

Мінчанка Таццяна КРЭТУШАВА — танцорка, якая ўжо дзесяць гадоў вучыць ахвотных майстэрству рухаў. Яшчэ ў дзяцінстве дзяўчына зразумела, што яе будучыня будзе звязана з рытмамі і музыкай. З 5 да 12 гадоў жыццё Тані было напоўнена бальнымі танцамі, з 14 і да сёння — сучаснымі. Зараз суразмоўніцы 28, і яна ўпэўнена, што абраны ёй занятак — назаўсёды.

«ЛЮБЛЮ ТАНЦАВАЦЬ БОЛЬШ, ЧЫМ ПЕРАМАГАЦЬ»

— Бацькі адвялі мяне на бальныя танцы, прычым гэта было не толькі дзеля баўлення вольнага часу: я ўдзельнічала ў розных конкурсах, спаборніцтвах, хадзіла ў групу, дзе былі дзеці, старэйшыя за мяне на гады два-тры (хутка ўсяму вучылася). Бацькі аддавалі апошнія грошы, толькі каб я не спынялася. А я і не збіралася, мне падабалася! Праз нейкі час пачала займацца сучаснымі танцамі — хіп-хопам. У мяне ўсё атрымлівалася. Магчыма, таму, што ў дзяцінстве мышцы яшчэ цалкам не сфарміраваныя і цела лёгка гнулася.

— Калі ты прыйшла да таго, што хочаш вучыць іншых, быць трэнерам?

— Не магу «танцаваць у пустэчу», мне патрэбны глядач. А лепш, каб іх было шмат, таму і стала выкладаць. Адбылося гэта ў даволі раннім узросце — у 18 гадоў. Пасля да хіп-хопа далучыліся больш дзявочыя яго кірункі. Энергіі ў мяне хоць адбаўляй, таму зараз да ўсяго іншага дадала і дэнсхол — выкладаю яго ўжо некалькі гадоў. Рытм, камбінацыі рухаў, настрой... Нібыта родны стыль, якім я займалася ўсё жыццё.

— Як ты сумяшчала рэпетыцыі, выступленні з семінарамі і сесіямі падчас вучобы ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце?

— Ох, як магла! Але ўсё забывалася падчас выступленняў. Я ж вучылася на перакладчыка, думала, буду працаваць па спецыяльнасці. Але зразумела, што танцы люблю больш, бо гатова аддаваць свае сілы гэтаму кожны дзень: і калі хварэла, і ва ўсе дні адпачынку, і ў хвіліны ляноты.

(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)

Пазнаёміцца з прафесіяй

МАЙСТАР ЛЕСУ НЕ БАІЦЦА!

Навошта сушыць шышкі і ставіць на дрэвах фотапасткі

«Усё думаю паспрабаваць уключыць падчас работы крокамер. Калі пералік дрэў робіш, бывае, так набегаешся, што ў канцы дня ногі гудзяць», — усміхаецца Дзмітрый АКУЛОВІЧ. Майстрам лесу ў Лагойскім лясгасе ён працуе крыху менш за год. Ужо асвоіўся, хоць першыя месяцы было няпроста. «Складана напачатку весці дакументацыю і бухгалтэрыю. Запаўняць накладныя і пісаць справаздачы нас ва ўніверсітэце не вучылі», — жартуе хлопец.

З раніцы падмарожвае. Затое ў лесе сапраўдная зімняя казка: на галінках сосен асеў снег, і мы, гарадскія жыхары, хутчэй фатаграфуем гэты пейзаж для «Інстаграм».

У Козырскае лясніцтва хлопец, выпускнік факультэта тэхналогіі і тэхнікі лясной прамысловасці БДТУ, трапіў па размеркаванні. Прафесію выбраў з пасылу бацькоў.

— Тата цесляром працуе, я з ім з дзяцінства ў лес ездзіў, вось і пацягнула ў гэту сферу. Займацца машынамі ці сельскай гаспадаркай мне было б нецікава, — дзеліцца суразмоўнік.

На пачатку працоўнага дня Дзмітрый размяркоўвае работы паміж леснікамі, завозіць іх на дзялянкі, дзе трэба нарыхтаваць бярвёны. Потым сам едзе адпускаць прадукцыю ці адводзіць лесасекі — адмяжоўвае ўчасткі, на якіх будзе праходзіць наступная высечка. Спецыяліст тлумачыць, што пад яе трапляюць дрэвы, якія дасягнулі «спелага» ўзросту (напрыклад, для сасны гэта 80—90 гадоў). Замест іх абавязкова садзяць новыя.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

На работу ў лясгас Дзмітрый Акуловіч трапіў па размеркаванні.

Прыступкі поспеху

НАПЕРАД — НЕ ЗНАЧЫЦЬ УВЕРХ

Неўзабаве трэба быць гатовым змяніць за жыццё да 10 прафесій

«Наша будучыня — не палепшаная версія мінулага. Яна цалкам непрадказальная. Эра ведаў скончылася і пачынаецца эра мыслення. Дыплом, як траставы сертыфікат універсітэта, страчвае сваю значнасць. Адукацыя становіцца «канструктарам» з ведаў, якія чалавек можа сабраць, прычым неаднойчы за сваё жыццё. І спрэчка, хто важнейшы — «тэхнары» ці «гуманітарыі», — больш не актуальная», — у гэтым упэўнена незалежны HR-кансультант у сферы IT, прафесійны коўч і трэнер, ментар па развіцці кар'еры Аміна ІДЗІГАВА. Як спраектаваць сваю будучыню? Кім быць, каб праз 10—15 гадоў не застацца без працы? Хто са спецыялістаў будзе запатрабаваны? Якія прафесіі могуць з'явіцца і каго заменяць робаты? Пра ўсё гэта Аміна Ідзігава расказала ўдзельнікам дзелавой канферэнцыі для падлеткаў «GURU Будучыні», якую арганізавала бізнес-акадэмія TeenGuru.

ЛЮДЗІ ЦІ РОБАТЫ?

— Калі мы кажам, што робаты захопяць свет, мы чамусьці ўяўляем сабе андроідаў, але насамрэч робаты выглядаюць зусім інакш, і яны ўжо захапілі наш свет, — кажа Аміна. — Робаты суправаджаюць нас у паўсядзённым жыцці, спрашчаюць яго, робяць больш прадказальным. Я маю на ўвазе алгарытмы. Фітнес-гадзіннік расказвае, колькі мы зрабілі крокаў, як спалі і калі павінны прачнуцца. Робат-пыласос можа ў запраграмаваны час сам уключыцца і прыбрацца ў доме. Разумны халадзільнік паведаміць, што ў нейкіх прадуктаў скончыўся тэрмін прыдатнасці і закажа патрэбны тавар у краме. Нават банкаматы — гэта таксама робаты. Алгарытмы збіраюць даныя і на падставе іх аналізу прымаецца тое ці іншае рашэнне. Прывяду канкрэтны прыклад. Мая сяброўка жыве ў Дубаі. Там яна трапіла ў дарожна-транспартнае здарэнне. Чужы джып сутыкнуўся з яе джыпам. Як вы думаеце, колькі часу ёй спатрэбілася, каб атрымаць страхоўку? З моманту сутыкнення прайшло ўсяго шэсць хвілін. Прычым на месца здарэння не выязджала паліцыя, ніхто не спыняў рух, а проста прыляцелі дроны, зрабілі фатаграфіі, штучны алгарытм прааналізаваў фота з пашкоджаннямі, зверыў іх з мноствам іншых падобных, ацаніў, колькі гэта каштуе па папярэдніх аналагічных выпадках, і праз шэсць хвілін сяброўка атрымала кампенсацыю на свой электронны рахунак.

Мяркую, што далей алгарытмы будуць нас аналізаваць і даваць рэкамендацыі глабальнага маштабу: што нам лепш насіць, з кім жаніцца, якія прадукты спажываць. Але ёсць адна важная акалічнасць: можна стварыць штучны інтэлект, а не штучную свядомасць. Чаму? Таму што алгарытмы вучацца толькі на прыкладах, якія мы ім даём: уласнай інтуіцыі і ўласнага крэатыву ў іх няма. Алгарытм не можа стварыць нічога новага, ён можа толькі сабраць новае са старых кубікаў, якія прыдумаў чалавек. Апошнія дваццаць гадоў я займаюся тым, што дапамагаю работадаўцам зразумець, хто ім патрэбны, як прыцягнуць кандыдатаў, як іх утрымаць і як павысіць прадукцыйнасць працы. Я менеджар па персанале — той, хто стаіць на ўваходзе у кампанію вашай мары, і вось да якіх высноў я прыхожу. З'явіліся алгарытмы, якія саманавучаюцца, самаўдасканальваюцца, не памыляюцца, не просяць павысіць зарплату ці даць адпачынак. Яны адбіраюць у нас пэўную частку работы, але толькі тую, якую лёгка алгарытмізаваць.

Раней, каб стаць таксістам у Нью-Ёрку, трэба было здаваць сур'ёзны экзамен на веданне горада, атрымліваць сертыфікат, а сёння прыйшоў Uber, аўтамабілі з навігацыйнымі сістэмамі, і гэтыя веды абясцэніліся. Праца, якую можна рабіць з выключаным мозгам, паступова алгарытмізуецца. Не пашанцуе гатэльнаму і рэстараннаму бізнесу, дзе вельмі высокі працэс аўтаматызацыі, транспарту, турыстычнай галіне, таму што купіць білет і спланаваць падарожжа цяпер можна, не пакідаючы канапы. У медыцыне таксама будзе адчувацца наступленне штучнага інтэлекту: калі доктар глядзіць ваш здымак, ён можа абапірацца толькі на свой уласны досвед, а алгарытм, у базе якога змяшчаюцца 12 мільёнаў падобных здымкаў, можа паставіць дыягназ нашмат хутчэй і дакладней, ён не памыляецца і абсалютна не эмацыянальны.

